# Мінсувязі выпускае ў абарачэнне паштовую марку «100-годдзе Міжнароднай федэрацыі філатэліі»

18 чэрвеня 2026 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне паштовую марку «100-годдзе Міжнароднай федэрацыі філатэліі».

Дызайн Я. Бядонік.

Марка друкавалася ў РУП «Бабруйская ўзбуйненая друкарня імя А.Ц. Непагодзіна».

Міжнародная федэрацыя філатэліі заснавана 18 чэрвеня 1926 года ў Парыжы (з фр. Fédération Internationale de Philatélie, скарочана – FIP).

Асноўная задача FIP – садзейнічанне развіццю філатэліі ў міжнародным маштабе, устанаўленне сяброўскіх сувязей і супрацоўніцтва паміж філатэлістамі розных краін для ўмацавання міру і дружбы паміж народамі.

У аснове маркі і на канверце Першага дня – лагатып Міжнароднай федэрацыі філатэліі.

Праект падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з Міжнароднай федэрацыяй філатэліі.

У дзень выпуску паштовай маркі ў абарачэнне на паштамце Мінска будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

Набыць дадзеную прадукцыю можна з 18чэрвеня ў інтэрнэт-магазіне РУП «Белпошта» shop.belpost.by, «Паштовым салоне» (г. Мінск, пр. Незалежнасці, 10, паштамт), аддзяленнях паштовай сувязі рэспублікі (наяўнасць неабходна ўдакладняць), а таксама запоўніўшы заяўку на сайце прадпрыемства ў раздзеле «Філатэлія» ва ўкладцы «Пакупніку».

Изображение




---

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/node/11402*